**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за снежань 2021 г.

## Мерапрыемствы ў рамках Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу

**1 снежня**

У бібліятэцы праведзены актуальны дыялог «СПИД: касается ли это тебя?». Супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа г. Кобрына з гісторыяй захворвання, з міжнародным сімвалам барацьбы са СНІДам. Лекар па медыцынскай прафілактыцы Кобрынскай ЦРБ **Святлана Васільева** распавяла прысутным аб эпідсітуацыі па ВІЧ-інфекцыі ў Кобрыне і Кобрынскім раёне, пра спосабы перадачы віруса, правілы абароны і інш. Прадстаўлена відэапрэзентацыя «Не опоздай спасти здоровье».

ЦБ, 28 чал.

**1 снежня**

У рамках Дня прафілактыкі «О СПИДе громко и всерьёз» бібліятэка сумесна з сярэдняй школай правяла акцыю «Моя жизнь в моих руках», падчас якой сацыяльны педагог **Любоў Бурштын** распавяла прысутным аб магчымых прычынах і наступствах захворвання. Кожнаму ўдзельніку навучэнцы школы ўручылі інфармацыйныя лісты «Защити себя от СПИДа» і прымацавалі чырвоныя стужачкі. Увазе наведвальнікаў прадстаўлена выстава «Не стань жертвой СПИДа».

Навасёлкаўская ПБ, 20 чал.

**1 снежня**

Падчас урока-папярэджання «СПИД без грима» бібліятэкар распавяла вучням 10-11 класаў, што такое ВІЧ-інфекцыя, чым адрозніваецца ад СНІДу, уручыла інфармацыйны ліст «Твоё здоровье – в твоих руках». Урач-валеолаг цэнтра «Арыенцір» **Філіпеня В. Г.** расказала пра спосабы перадачы віруса і правілах прафілактыцы, пазнаёміла са статыстыкай захворванняў СНІДам у Кобрыне і Кобрынскім раёне. Прысутным прапанавана ананімна запоўніць анкету «СПИД – это опасно: не рискуй напрасно» і адказаць на шэраг пытанняў.

Магдалінская ПБ, 20 чал.

**3 снежня**

У бібліятэцы прайшоў інфармацыйны блок «Жить или…!», дзе бібліятэкар расказала прысутным пра шляхі перадачы інфекцыі, пра тое, як сябе засцерагчы і абараніць, падарыла гасцям буклет, выдадзены бібліятэкай «Профилактика ВИЧ-инфекции».

Гарадзецкі філіял, 22 чал.

**Мерапрыемствы да Дня правоў чалавека**

**3 снежня**

У рамках сумеснага праекта ПЦПІ бібліятэкі і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Бібліятэка і натарыят: узаемавыгаднае супрацоўніцтва» працягваюцца бясплатныя кансультацыі натарыуса. Чарговую сустрэчу для чытачоў, жыхароў горада правяла **Ірына Пятроўна Марчук**, загадчык натарыяльнай канторай Кобрынскага раёна.

*(Кобрынскі веснік. – 2021. – 15 снежня. – С. 5).*

ЦБ, 12 чал.

**3 снежня**

У рамках сумеснага праекта ПЦПІ бібліятэкі і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Бібліятэка і натарыят: узаемавыгаднае супрацоўніцтва» для моладзі горада натарыусам **Ірынай Марчук** праведзена лекцыя, у ходзе якой асветлены актуальныя пытанні тэорыі і сучаснай практыкі пасведчання шлюбных дагавораў, атрымання ў спадчыну маёмасці і іншых паслуг, якія карыстаюцца найбольшым попытам.

ЦБ, 23 чал.

**З 1 па 8 снежня**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры бібліятэкі праведзены цыкл масавых мерапрыемстваў "Право знать о праве" з мэтай фарміравання прававой культуры.

На працягу гадзіны юрыдычнага прасвятлення «Твои права от "А" до "Я"», дзелавой гульні «Знай свои права и будь готов к ответственности», агляда каля кніжнай выставы «Правовое ассорти» ўдзельнікі, студэнты розных груп Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа г. Кобрына, пазнаёміліся з Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека, іншымі важнейшымі міжнароднымі дакументамі. Размова суправаджалася слайд-прэзентацыяй.

Навучэнцы выконвалі розныя заданні, вырашаючы нестандартныя сітуацыі, адказваючы на тэставыя заданні, удзельнічаючы ў трэнінгах па прававой граматнасці, самастойна ажыццяўлялі пошук нарматыўна-прававых дакументаў у сістэме «ЭТАЛОН».

*(Кобрынскі веснік. – 2021. – 15 снежня. – С. 5*
*Кобрин-информ. – 2021. – 9 декабря. – С. 19).*

**9 снежня**

У бібліятэцы сабраліся выхаванцы дзіцячага дома на ўрок права «От правил – к праву». Падарожнічаючы па казачнай краіне «Право», дзеці пазнаёміліся з Канвенцыяй аб правах дзіцяці, прачыталі некаторыя артыкулы і прывялі прыклады з казак і дзіцячых апавяданняў. Адказалі на пытанні віктарыны «От правил – к праву», пагулялі ў гульню «Разрешается – запрещается», здзейснілі мультыплікацыйнае падарожжа «Азбука права ребёнка», паслухалі агляд кніжнай выставы «Правовая неотложка».

Дзівінскі філіял, 19 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**2 снежня**

Падведзены вынікі раённага конкурсу на лепшую кніжную выставу «Чытаем Багдановіча разам». Пераможцамі конкурсу сярод публічных бібліятэк раёна сталі бібліятэкары Арэхаўскай, Залесскай і Дзівінскай публічных бібліятэк.

**6 снежня**

Бібліятэка правяла экалагічную акцыю «Покормите птиц зимой». Бібліятэкар расказала пра дапамогу чалавека птушкам, якія зімуюць у Беларусі, правяла бібліяграфічны агляд кніжнай выставы «Трудно птицам зимовать, надо птицам помогать!». Дзеці адгадвалі загадкі пра птушак, адказвалі на пытанні віктарыны «Зимующие птицы Беларуси», а потым вырабілі кармушкі з падручнага матэрыялу і развесілі іх каля бібліятэкі.

Батчынская ПБ, 17 чал.

**24 снежня**

Пасяджэнне літаратурнага клуба «ПаэтыКо», які працуе пры Кобрынскай цэнтральнай раённай біблітэцы, яго члены прысвяцілі 130-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча.

Да сабраўшыхся ў інфармацыйна-сэрвісным цэнтры бібліятэкі паэтаў далучыліся падключаныя праз інтэрнет калегі па літаратурным цэху з Кобрынскага раёна і г. Брэста.

Творцы дзяліліся сваімі вершамі, у тым ліку санетамі, напісанымі ў якасці дамашняга задання. А Надзея Момлік нават напісала вянок санетаў, ужо трэці ў яе творчай скарбонцы, за што атрымала прыз. Кіраўнік клуба Наталля Ефціфеева правяла віктарыну па жыццю і творчасці Максіма Багдановіча і ўзнагародзіла пераможцаў. Першае месца заняла Алена Котава.

Фінальным акордам праграмы стала прэзентацыя альманаха «Берасцейская скарбніца», у якім надрукаваны нататкі пра літаратурны клуб «ПаэтыКо» і творы пяці «паэтыкаўцаў».

*(Культура. – 2021. – 18 снежня. – С. 11).*

ЦБ, 26 чал.

## Выдавецкая дзейнасць

Інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік «Малой радзімы прыцяжэнне», прысвечаны 475-годдзю з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах вёсак Лелікава, Павіцце Кобрынскага раёна, выдадзены бібліёграфамі цэнтральнай бібліятэкі. Выданне мае разгорнутую структуру і свой унікальны фармат. Аповед пра два населеныя пункты Кобрыншчыны сабраны пад адной вокладкай у незвычайнай падвойнай форме - «лелікаўская» і «павіццеўская» часткі паказальніка размешчаны люстрана.

Бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтаваны «Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны» на 5 гадоў (гл. Краязнаўства Краязнаўчыя выданні).

Да Дня праў чалавека бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі складзены бібліяграфічны спіс літаратуры «Мае правы – мая абарона», прадстаўлены 136 крыніцамі. Спіс літаратуры, прымеркаваны да Дня правоў чалавека, рэкамендуе нарматыўныя дакументы, актуальныя кнігі і артыкулы па тэме і накіраваны на развіццё прававой культуры.

*(Кобрынскі веснік. – 2021. – 15 снежня. – С. 5)*

Метадыстамі аддзела маркетынгу цэнтральнай бібліятэкі выдадзены зборнік вершаў Наталлі Цярэнцьевай – кобрынскай паэтэсы, члена народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел» «Поэт начинается с боли».

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81